Французский словарь «Ларусс» называет Сутина «французским художником литовского происхождения», немецкий «Майер-Лексикон», повторяя это, добавляет: «из Минской губернии России». Почти неизвестный у себя на родине, Сутин имеет всемирную славу. Его память чтут во многих странах мира, его картины украшают лучшие частные и государственные галереи Парижа, Нью-Йорка, Чикаго, Вашингтона, Филадельфии.

Мы имеем много исторических примеров, когда уроженцы Беларуси, жившие за ее пределами, создавали свои произведения искусства совсем не в рамках белорусской культуры. Так и X. Сутин имел, по существу, две Родины. И хотя основные его произведения создавались не в Беларуси, тем не менее его творчество относится и к белорусской культуре.

Творчество Сутина формировалось на пересечении четырех культур: еврейской, белорусской, русской и французской. Он — один из первых авангардистов, чья художественная судьба разворачивается на пересечении культурных путей. От самых разных интонаций он идет к всеобщности и всечеловечности. Этим, пожалуй, и объясняется способность художника посредством своих произведений вести диалог со всем миром.

В контексте современных интеграционных процессов возвращение имени Сутина на родину, осознание значимости его творчества имеет для Беларуси огромное значение: способствует расширению культурного пространства Беларуси, сближению белорусской культуры с другими культурами мира.

Перспективными направлениями международного сотрудничества в области культуры также сегодня являются развитие культурного туризма, широкое использование для трансляции культуры новых технологий, системы Интернет.

ЛИТЕРАТУРА

1. Бахтин М. М. Эстетика словесного творчества. М., 1979.

***Shelypenko N. E.***

*INTERNATIONAL COOPERATION AS A FACTOR OF DEVELOPMENT OF BELARUSIAN CULTURE*

*This article is devoted to the problem of culture interaction as the source of renovation and development of national cultures. The author examines main trends and forms of international cooperation in the sphere of culture. The prospective directions of international cultural cooperative are defined.*

## КАДРАВАЯ СІСТЭМА ГАЛІНЫ КУЛЬТУРЫ Ў РАЗВІЦЦІ

**Сцепанцоў А. І.,**
**старшы выкладчык кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**

Дзяржава як асноўная крыніца палітычнай улады забяспечвае праз кадры «сацыяльную настройку» грамадзян у межах ажыццяўлення дзяржаўнай культурнай палітыкі. Вядома, што асноўныя задачы культурнай палітыкі, як і роля дзяржавы, мяняюцца ва ўзаемасувязі з палітычнай сітуацыяй. Але відавочна, што развіццё культуры як прагрэсіўны працэс аб'ядноўваецца імкненнем да даступнасці і якасці культурных благ і паслуг. Палітычныя мэты маюць вялікі ўплыў на грамадства, а значыць, і на культуру, іх агульная прагрэсіўная тэндэнцыя праяўляецца ў такіх дзеяннях органаў культуры, як арганізацыя падрыхтоўкі кадраў культуры, падтрымка сеткі ўстаноў культуры, ахова творцаў, падтрымка спажыўцоў культурных каштоўнасцей.

Асновай, сутнасцю культурнага працэсу з'яўляецца чалавечы фактар, які заўсёды меў вырашальнае значэнне. Чалавек, асоба – заўсёды ў цэнтры сацыякультурнай дзейнасці, ён вытворца мастацкіх каштоўнасцей і арганізатар вольнага часу. Таму кадравая работа ў сферы культуры — аснова кіравання на ўсіх узроўнях: ад сельскага клуба, бібліятэкі да Міністэрства культуры. Гэтаму працэсу кіраўніцкай дзейнасці ўласціва пэўная паслядоўнасць: ад пошукаў талентаў у дзіцячым асяроддзі і далучэння іх да мастацтва, падтрымкі ў час навучання і раскрыцця мастацкага патэнцыялу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да стварэння ўмоў у станаўленні як прафесіяналаў і творчага ўдасканалення, пастаяннага павышэння кваліфікацыі і набыцця дадатковых мастацкіх кваліфікацый, маральнага і матэрыяльнага заахвочвання ў прафесійнай дзейнасці.

**Гісторыя станаўлення кадравай сістэмы культуры** ў Беларусі звязана з ажыццяўленнем культурнага будаўніцтва. Гэта была мэтанакіраваная дзяржаўная дзейнасць, якая пачала ажыццяўляцца з моманту абвяшчэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў студзені 1919 г. Створаны ў гэты ж месяц Народны камісарыят асветы БССР прыняў праграму ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва, разгортвання пачатковых школ, культурна-асветных устаноў. У першыя гады дзяржава адразу паспрыяла арганізацыі сеткі самадзейных гурткоў, студый, мастацкіх калектываў, якія далучалі насельніцтва да мастацтва. У агульнаадукацыйных школах было ўведзена абавязковае выкладанне музыкі і малявання. Ажыццяўлялася шырокая канцэртна-асветніцкая дзейнасць прафесіяналаў і аматараў у галіне музычнага мастацтва і выставачная дзейнасць у галіне выяўленчага мастацтва. Актыўнае развіццё сферы культуры патрабавала адпаведных кадраў, і кіраўнічыя органы дзяржавы адначасова з рашэннямі аб умацаванні і пашырэнні сеткі ўстаноў культуры прымалі рашэнні і аб разгортванні сістэмы падрыхтоўкі кадраў. Адкрываліся адукацыйныя ўстановы мастацтва: акцёрскія і мастацкія студыі, народныя мастацкія школы, народныя кансерваторыі, тэхнікумы і вучылішчы. **Разам з культурнай асветай насельніцтва фарміраваліся кадравыя рэсурсы культуры.**

Масавы выпуск спецыялістаў дазволіў у кароткі тэрмін умацаваць прафесійныя мастацкія калектывы, удасканаліць сістэму культурна-асветнай работы ў рэспубліцы, павялічыць колькасць прафесіяналаў-выкладчыкаў прадметаў мастацтва ў школах. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах закладаліся першапачатковыя прафесійныя навыкі, даваліся практычныя веды ў сферах мастацтва і культуры, фарміраваўся малады спецыяліст, здольны працягваць самадукацыю, весці практычную самастойную працу. Выкладчыкі гэтых навучальных устаноў назапашвалі вопыт педагагічнай работы, што дазваляла ў далейшым выкарыстоўваць іх у новых ВНУ.

Чатырнаццаць гадоў існавання сярэдняй спецыяльнай адукацыі лагічна прывялі да адкрыцця ў 1932 г. першай вышэйшай навучальнай установы — Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Да пачатку вайны кансерваторыя дала пяць выпускаў выканальніцкіх спецыяльнасцей і два выпускі студэнтаў тэарэтыка-кампазітарскага факультэта. Пры кансерваторыі існавалі музычныя курсы для дарослых, мэтай якіх было павышэнне кваліфікацыі ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці і падрыхтоўка кіраўнікоў самадзейнага музычнага мастацтва.

Такім чынам, у 1918-1940 гг. у агульнай сацыякультурнай прасторы краіны ажыццяўлялася мэтанакіраванае культурнае будаўніцтва (стварэнне інстытуцыянальнай культурна-асветнай сістэмы) адначасова з фарміраваннем прафесійнай мастацкай адукацыі як асновы будучай дзяржаўнай кадравай сістэмы. Пачатак быў пакладзены развіццём масавых форм навучання ў сярэдніх спецыяльных (вузкаспецыялізаваных адукацыйных) навучальных установах.

1944-1984-я гг. — перыяд аднаўлення краіны пасля ўрону, нанесенага Вялікай Айчыннай вайной, і інтэнсіўнага адраджэння і ўдасканалення культурна-асветнай сістэмы, разгортвання прафесійнага мастацтва. Адначасова адраджалася і працягвала развівацца адукацыйная падсістэма культуры — крыніца папаўнення кадравых рэсурсаў культуры. Гэты час вызначаўся адкрыццём Беларускага тэатральнага інстытута ў 1945 г., яго мастацкага факультэта — у 1953 г., Мінскага інстытута культуры — у 1975 г. Ажыццяўлялася масавае адкрыццё дзіцячых школ мастацтваў — пачатковых устаноў прафесійнай арыентацыі ў галінах мастацтва і культуры. Тры ВНУ культуры рэспублікі забяспечвалі кадрамі тэатральна-відовішчныя прадпрыемствы, навучальныя ўстановы культуры, культурна-асветныя ўстановы. Рабіліся першыя крокі па стварэнні нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў праз аспірантуру і асістэнтуру-стажыроўку.

**1985-1995-я гг. — рух да цэласнага ўтварэння сукупнасці адукацыйных адзінак галіны культуры, інтэграцыі ўзаемна звязаных узроўняў адукацыі ў адзіную адукацыйную сістэму бесперапыннай прафесійнай адукацыі.** Гэты перыяд вызначыўся прыкладам праграмна-мэтавага падыходу да рашэння кадравых праблем. У 1985 г. Міністэрства культуры Беларусі распрацавала «Галіновую праграму развіцця «Кадры» на перыяд да 1990 года» (зацверджана Пастановай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калегіі ад 23 студзеня 1986 г.). Упершыню фармуляваліся комплексныя арганізацыйныя падыходы, вызначаліся неабходныя практычныя меры, накіраваныя «на поўнае забеспячэнне ўстаноў культуры і мастацтва кваліфікаванымі спецыялістамі, стварэнне ўмоў іх ідэйна-палітычнага, прафесійнага росту і замацавання».

Скіраванасць на задавальненне патрэбнасцей галіны ў спецыялістах мела станоўчы вынік для складання далейшых праграм падрыхтоўкі кадраў. Гэты праграмны дакумент Міністэрства культуры ў цэлым аказаў станоўчы ўплыў на кадравую стратэгію галіны, бо ўпершыню была заяўлена неабходнасць ужывання праграмна-мэтавага падыходу пры планаванні развіцця галіны, і ў першую чаргу — сістэмы кадраў. Галіновая праграма падштурхнула ўсе ўзроўні ўпраўлення ўстановамі культуры да планамернай работы па фарміраванні кадравага саставу, здольнага сістэмна вырашаць праблемы культурнага развіцця.

Навейшае дзесяцігоддзе (1996-2005 гг.) — гэта ўзмацненне і далейшае развіццё агульнадзяржаўных падыходаў да кадравага будаўніцтва, фарміраванне сістэмы шматузроўневага і паслядоўнага бесперапыннага прафесійнага ўдасканалення спецыялістаў сферы культуры.

У 2001 г. была прынята Канцэпцыя дзяржаўнай кадравай палітыкі Рэспублікі Беларусь (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 18.07.2001 № 399). У дакуменце сфармулявана паняцце дзяржаўнай кадравай палітыкі як дзейнасці рэспубліканскіх і мясцовых органаў упраўлення па стварэнню цэласнай сістэмы фарміравання і эфектыўнага выкарыстання працоўных рэсурсаў, развіцця кадравага патэнцыялу органаў дзяржаўнага ўпраўлення і самаўпраўлення, розных галін эканомікі і сфер дзейнасці, арыентаванай на эфектыўнае рашэнне актуальных эканамічных, сацыяльных і палітычных задач. Вызначаны асноўныя кірункі ў фарміраванні сучасных патрабаванняў да кадраў розных сфер дзейнасці і ўзроўняў упраўлення, удасканаленню формаў і метадаў іх ацэнкі; падбору і рацыянальнаму выкарыстанню кадраў з улікам іх прафесійных і маральна-псіхалагічных якасцей, матывацыі і стварэнню спрыяльных умоў для іх эфектыўнай працы і прафесійнай кар'еры; фарміраванню дзейснага рэзерва кіруючых кадраў, удасканаленню сістэмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў.

Для сацыяльна-культурнай сферы вызначана неабходнасць увядзення сістэмы сярэднетэрміновага і доўгатэрміновага прагназавання патрэбнасці кадраў і пераважна мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў на падставе дзяржзаказу; стварэння баз і банкаў даных аб кадравым патэнцыяле сацыяльна-культурнай сферы; стварэння спрыяльных умоў для работнікаў, іх прафесійнай кар'еры, развіцця страхавога механізма і льготнага крэдытавання атрымання адукацыі, набыцця жылля; павышэння ўзроўню сацыяльнага забеспячэння работнікаў гэтай сферы, аплаты іх працы за кошт розных крыніц, уключаючы развіццё гасразліковых і камерцыйных падстаў дзейнасці ўстаноў аховы здароўя, адукацыі і культуры; прыняцця дзейсных мер па прафесійнай арыентацыі моладзі, духоўнаму фарміраванню асобы, умацаванню сям'і і матэрыяльнай падтрымцы маладых спецыялістаў.

У выкананне пастаўленай дзяржаўнай задачы Беларускім інстытутам праблем культуры была распрацавана праграма кадравага забеспячэння галіны культуры «Кадры культуры — 2001—2005 гг.» (зацверджана рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь 29.11.2001 г. № 12 п. 4). Яна з'явілася часткай Дзяржаўнай праграмы «Функцыяніраванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года» і мела мэтай удасканаленне сістэмы работы з кадрамі, укамплектаванне ўстаноў культуры высокакваліфікаванымі спецыялістамі, здольнымі ажыццяўляць сацыяльна-культурную палітыку дзяржавы. Пяць раздзелаў праграмы скіроўвалі на ўдасканаленне механізма забеспячэння галіны культуры кадрамі; павышэнне эфектыўнасці падбору, расстаноўкі і ацэнкі кадраў; развіццё сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў культуры.

Прадугледжвалася правядзенне аналізу шэрагу з'яў у кадравай сітуацыі, стварэнне адпаведных методык па ўдасканаленню работы з кадрамі, распрацоўка кваліфікацыйных характарыстык спецыялістаў, удасканаленне механізма і пашырэнне практыкі дыягнасціравання прафесійна-дзелавых і асабістых якасцей работнікаў пры іх атэстацыі, вылучэнне рэзерва на кіруючыя пасады, стварэнне банкаў даных кадравага патэнцыялу, сістэмы яго маніторынга; распрацоўка адукацыйных стандартаў для ССНУ і ВНУ культуры ў адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам спецыяльнасцей і кваліфікацый; распрацоўка прагнозу патрэбнасці ў перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі

кіруючых кадраў і спецыялістаў культуры; пашырэнне мэтавай падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў у адпаведнасці з патрэбамі рэгіёнаў; планаванне тэматыкі дысертацыйных даследаванняў у адпаведнасці з патрэбамі галіны, перспектывамі яе развіцця; стварэнне і папаўненне зводнага рэестру тэм навуковых даследаванняў, зацверджаных саветамі ВНУ; актывізацыя прытоку творчай моладзі ў навуку, стымуляванне навуковых даследаванняў у сферы культуры.

Агульнадзяржаўныя задачы ўдасканалення кадравай сістэмы паспрыялі фарміраванню і развіццю бесперапыннай сістэмы прафесійнага ўдасканалення кадраў культуры, якая разгорнута па ўзроўнях ускладнення адукацыйнай і творчай дзейнасці і забяспечвае засваенне асноўных трансляцыйных форм сістэматызаваных ведаў, канкрэтных (відавых) тэхналогій мастацкай культуры.

Працяглы тэрмін існавання адукацыі ў сферы культуры, яе пэўная працягласць, якая праяўляецца ў развіцці культурнага працэсу ў рэспубліцы, у фарміраванні кадравага саставу сферы культуры, павышэнні яго адукацыйнага ўзроўню, дазваляе прапанаваць мадэль узроўняў бесперапыннага прафесійнага ўдасканалення ў сферы культуры.

| Узроўні адукацыі | Змест навучання | Тып навучальнай установы | Этапы сацыялізацыі |
|---|---|---|---|
| 1<br>Прафесійна-арыентацыйны | Падтрымка праяўленняў творчых здольнасцей і схільнасцей, выяўленне творчага патэнцыялу, прафесійнае арыентаванне, замацаванне ў абраным кірунку мастацкай творчасці, паглыбленая спецыялізацыя з мэтай паступлення ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. | Сярэднія класы агульнаадука-цыйных школ і старэйшыя класы дзіцячых школ мастацтваў | 12-15 гадоў, падлеткі |
| 2<br>Прафесійны сярэдні | Практычнае засваенне мастацкіх навыкаў і уменняў, спалучаючы пашырэнне прафесійнага, спецыяльнага трэнажу (рухальных навыкаў) і творчага развіцця асобы: фантазіі, інтэлекту, мастацкіх эмоцый і густу, тэарэтычных прынцыпаў, форм і метадаў у абранай спецыяльнасці, набыццё кваліфікацыі. Творчыя праявы і замацаванне мастацкай індывідуальнасці ў розных відах практыкі. | Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы культуры і мастацтваў | 15-19 гадоў, юнацтва |
| 3<br>Прафесійны вышэйшы | Прафесійнае самавызначэнне і самаідэнтыфікацыя, паглыбленне спецыяльных ведаў, выхаванне прафесіянала ў сферы культуры — «профільнага ўзнаўляльніка-інтэрпрэтатара актуальных культурных форм і творцы — распрацоўшчыка новых форм» з імкненнем да няспыннага ўдасканалення. Засваенне фундаментальных і прыкладных ведаў і уменняў па вучэбных прадметах, функцыях і тэхналогіях будучай дзейнасці, а таксама прынцыпаў адпаведнай прафесійнай культуры. Замацаванне навыкаў інавацыйнай дзейнасці ў абранай сферы, засваенне сістэмы «культурнай кампетэнтнасці». | Вышэйшыя навучальныя ўстановы культуры і мастацтваў | 19-25 гадоў, позняе юнацтва |
| 4<br>Майстэрства | Удасканаленне прафесіяналізму, спецыялізацыя на абраным кірунку сацыякультурнай дзейнасці, навуковае і творчае асэнсаванне мастацкай дзейнасці, стварэнне і прапаганда мастацкіх каштоўнасцей. | Магістратура, аспірантура, асістэнтура-стажыроўка, факультэты павышэння кваліфікацыі ВНУ культуры і мастацтваў, паслядыпломныя ўстановы адукацыі. Самаадукацыя. | 25-60 гадоў, чалавечая сталасць |
| Самасцвяр-джэнне | Здабыванне сацыяльнай і прафесійнай сталасці, самарэалізацыя, самаўдасканаленне ў мастацтве — пастаяннае развіццё і рэгуляцыя індывідуальна-асобасных якасцей; паглыбленне тэарэтычных ведаў, навуковых распрацовак; павышэнне кваліфікацыі (пастаяннае, перыядычнае), перападрыхтоўка — набыццё новых кваліфікацый. | | |

Графічная мадэль дае ўяўленне пра мэтанакіраванасць і паслядоўнасць структурнага разгортвання сістэмы бесперапыннага прафесійнага ўдасканалення спецыялістаў культуры, забеспячэнне няспыннага працэсу фарміравання кадравага саставу, павышэнне яго адукацыйнага ўзроўню. Гэта важнейшы сацыяльны інстытут, які ажыццяўляе напраўленую форму сацыялізацыі, прафесійнае станаўленне і ўдасканаленне спецыялістаў, а таксама актыўна ўплывае на сацыяльнае асяроддзе.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Галоўныя складаючыя гэтай сістэмы цесна спалучаны з мастацкай культурай: мастацкая вытворчасць (стварэнне і інтэпрэтацыя мастацкіх каштоўнасцей) праяўляецца ў адпаведных спецыяльнасцях мастацкай адукацыі, рэпрадуктаванне (распаўсюджванне) мастацкіх каштоўнасцей, навуковае асэнсаванне — у спецыяльнасцях культуралагічнай адукацыі. Сістэма забяспечвае пошук і адбор таленавітай моладзі, яе навучанне і прафесійнае развіццё, удасканаленне і самасцвярджэнне ў грамадстве.

Бесперапыннасць прафесійнага ўдасканалння адпавядае няспыннасці культурнага працэсу і забяспечвае папаўненне яго суб'ектаў творчымі кадрамі, здольнымі быць стваральнікамі, інтэрпрэтатарамі і арганізатарамі культуры.

Стратэгія кіравання персаналам, або кадравая палітыка Міністэрства культуры, вылучае як цэнтральную мэту падтрымку сістэмы бесперапыннага прафесійнага ўдасканалення. Пры прыняцці адпаведных ўпраўленчых рашэнняў улічваецца шэраг фактараў, перш за ўсё дыспрапорцыі ў аказанні культурных паслуг гарадскому і сельскаму насельніцтву, а таксама ў рэгіёнах, дынаміка попыту і прапаноў пэўных відаў культурных паслуг, здольнасці персаналу па якаснаму іх стварэнню і аказанню, прыярырэтныя кірункі культурнай дзейнасці на розных этапах, перспектывы фінансавання з розных крыніц вытворцаў гэтых паслуг, дэмаграфічныя тэндэнцыі, сацыяльна-гарантаваны дзяржавай мінімум (стандарт) культурных паслуг, фінансавыя магчымасці розных груп насельніцтва па спажыванню тых ці іншых паслуг.

Імклівае развіццё культурных працэсаў у грамадстве патрабуе адсочвання і глыбокага аналізу зменлівага культурнага асяроддзя, выяўлення перашкод далейшага руху, удасканалення (карэкціроўкі) кадравай стратэгіі ў галіне культуры.

Вывучэнне дадзеных пытанняў дазваляе прапанаваць некаторыя **практычныя рэкамендацыі:**

- прывесці тыпавыя штаты ўстаноў культуры ў адпаведнасць з сацыяльна-культурнымі патрэбнасцямі насельніцтва і спецыяльнасцямі (спецыялізацыямі) вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў; аднавіць і ўдасканаліць сістэму фарміравання дзяржаўнага заказу на падрыхтоўку спецыялістаў на падставе патрабаванняў устаноў культуры;
- завяршыць распрацоўку Дзяржаўных стандартаў адукацыі па ўсіх спецыяльнасцях культуры; ліквідаваць разыходжанні ў змесце, метадах навучання і задачах прафесійнай дзейнасці спецыялістаў, наблізіць тэорыю і практыку навучання як ядра прафесійнай адукацыі;
- стварыць банк даных кадравага саставу галіны культуры, распрацаваць і ўкараніць схему перыядычнага павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў і спецыялістаў культуры, наблізіць яе перыядычнасць да нарматыўнай; пашырыць перападрыхтоўку спецыялістаў культуры, якія не маюць профільнай падрыхтоўкі з улікам патрэбнасцей устаноў культуры;
- павысіць якасны ўзровень арганізацыі вучэбнага працэсу сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў культуры, максімальна выкарыстоўваць актыўныя формы навучання (дзелавыя гульні, рашэнне практычных задач і сітуацый, выязныя заняткі і семінары па абмену вопытам работы), наладзіць выпуск друкаваных вучэбных дапаможнікаў, пашыранае выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій;
- з мэтай замацавання маладых спецыялістаў, накіраваных па дзяржаўнаму размеркаванню на працу ў раённыя і сельскія ўстановы культуры, вырашыць пытанне аб выдзяленні ім службовага жылля, таксама аб прадастаўленні ў далейшым малапрацэнтных ссуд для будаўніцтва ўласнага жылля.

**Stepantsov A. I.**

*PERSONNEL SYSTEM OF BRANCH OF CULTURE IN DEVELOPMENT*

*The modern personnel system of branch of culture is characterized by the generated institute of continuous perfection of experts of culture. There is a constant updating subjects of welfare activity by the creative staff, capable to be founders, interpreters and organizers of culture. The certain sequence is provided: from search of talents in the children's environment and their familiarizing with art, support during study and disclosing of creative potential, constant improvement of professional skill and reception of additional art qualifications, material and moral encouragement in professional work.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ